Падтрымай "Вясну" на PATREON

"Выкрыкваў лозунгі, пляскаў у далоні": да трох гадоў "хіміі" асудзілі ўдзельніка жнівеньскіх пратэстаў

22.11.2021 **Тэгі**: крымінальны пераслед, грамадства, свабода мірных сходаў



У Мінску каля Стэлы 9 жніўня 2020 года. Фота: AP

22 лістапада ў судзе Заводскага раёна вынесены прысуд 23-гадоваму Максіму Пражэніку. Яго прызналі вінаватым паводле ч.1 арт.342 Крымінальнага кодэкса і асудзілі да трох гадоў абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ — "хіміі". Прысуд вынес суддзя Алег Каляда, бок дзяржабвінавачання падтрымаў памочнік пракурора Заводскага раёна Дзятл. Мужчыну вызвалілі ў залі суда. Пазоў "Мінсктранса" на суму 3621,94 рублёў будзе вылучаны ў асобную грамадзянскую вытворчасць.

Максіма прызналі вінаватым у тым, што з 9 па 10 жніўня 2020 года ён знаходзіўся на праспекце Пераможцаў з мэтай публічнага выказвання сваіх поглядаў і пратэста, прымаў актыўны ўдзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак. Гэтыя дзеянні, паводле абвінавачання, пацягнулі за

сабой спыненне работы транспарту і прадпрыемстваў. Таксама ён не падпарадкаваўся патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі, далучыўся да групы грамадзян, выкрыкваў лозунгі, пляскаў у далоні, рухаўся па праезнай частцы ў счэпцы.

Мужчына прызнаў віну. Ён распавёў, што 9 жніўня выйшаў у цэнтр паглядзець, што там адбываецца, убачыў шмат людзей, супрацоўнікаў міліцыі, паддаўся ўплыву і ўстаў у счэпку. Прастаяў там пяць хвілінаў і адразу сыйшоў. Мэтай мерапрыемства лічыў *"паказаць, што мы прагаласавалі"*. Пазней каля 20 гадзін прыйшоў на Нямігу, там таксама былі людзі, а міліцыі спачатку не было. Яны сталі ў счэпку, калі з'явіліся супрацоўнікі ОУС, усе разбегліся. Максім распавёў, што не рухаўся па праезнай частцы, а стаяў на тратуары. Мужчына пагадзіўся не з усім абвінавачаннем: ён сказаў, што не разумее, адкуль узялася такая сума пазову, калі ён быў не адзін. Ён распавёў, што напісаў чыстасардэчнае прызнанне: на мерапрыемстве было шмат прэсы, якая рабіла фотаздымкі, і калі яго затрымліваў ГУБАЗіК, то паказаў яму шматразова павялічанае фота.


Сведка **Ганна Горава** — сябра Пражэніка. Яна распавяла, што пазнаёмілася з ім у канцы мінулага года — спачатку ў сацсетках, а потым асабіста. Яны камунікавалі наконт падзей, якія адбываліся, Максім распавёў ёй, што ўдзельнічаў у мерапрыемствах 9-10 жніўня 2020 года на Нямізе. Ён распавёў дзяўчыне, што адстойваў сваё меркаванне, а таксама быў збіты пры затрыманне. Яна бачыла адно ягонае фота ў інстаграме пад нікам. Праз супярэчнасці ў паказаннях пракурор папрасіў зачытаць допыт следчага ў кастрычніку 2021 года, падчас якога Ганна распавядала, што яны пачалі сустракацца, а таксама, што да дзеянняў улады ставіўся адмоўна. Падчас суда таксама было зачытанае ліставанне Ганны Горавай з чалавекам пад нікам "Бумбокс", падчас якой Бумбокс распавядаў, што быў ня мяжы таго, што яго "закрыюць", а таксама што магчыма, хутка яго спаймаюць, таму ён на "трывожнай валізцы". На пытанне Ганны, ці не думае ён бегчы, Бумбокс адказаў, што лепш "стане палітвязнем і потым атрымае грошы". Горава патлумачыла, што Максім казаў ёй, што на адным з тэлеграм-каналаў, зараз прызнаных экстрэмісцкім, абяцалі заплаціць тым, каго затрымлівалі — ён разлічваў на гэта. Але ён не распавядаў, ці плацілі яму грошы.


Падчас вобшука былі канфіскаваныя чырвоная майка і сінія джынсы, а таксама тэлефон.


Пракурор палічыў, што віна поўнасцю даказаная і запрасіў пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам тры гады з накіраваннем у ПУАТ — "хіміі". Мінсктранс папрасіў у выпадку прызнання віны спагнаць з яго 3621,94 рубля салідарна з ужо вызначанымі асобамі. Абаронца папрасіў прызначыць "хатнюю хімію" і вылучыць пазоў у асобную грамадзянскую вытворчасць. **Суддзя прызначыў Максіму Пражэніку тры гады "хіміі", пазоў будзе разгледжаны ў грамадзянскай вытворчасці.**

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

